Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЛІПЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 134 (27992) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Першыя вынікі прыёмнай кампаніі**

СТАР. 3



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег ТОКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

*«Зарэгістраванае беспрацоўе ў краіне ўжо тры месяцы захоўваецца на ўзроўні 1% ад эканамічна актыўнага насельніцтва: сітуацыя на рынку працы характарызуецца стабільнасцю. Колькасць зваротаў у службу занятасці па садзейнічанне ў працаўладкаванні і колькасць вакансій застаюцца без істотных змен, масавых вызваленняў работнікаў у сувязі з аптымізацыяй штату і скарачэннем не чакаецца. Прагназуем зніжэнне са жніўня патоку зваротаў грамадзян у службу занятасці. Спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны прыступілі да распрацоўкі праекта дзяржпраграмы «Сацыяльная абарона і садзейнічанне занятасці» на 2016-2020 гады. Гэта новы праграмны дакумент, які вызначыць асноўныя прыярытэты ў гэтай сферы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.07.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15317,00 | ▲ |
| Еўра | 16703,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 268,87 | ▼ |
| Укр. грыўня | 693,08 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# БЕЗ НЯВЫРАШАНЫХ ПЫТАННЯЎ І ЗАКРЫТЫХ ТЭМ

## Наша краіна гатова да рэалізацыі новых праектаў з Малдовай

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на перагаворах у Мінску з Прэзідэнтам Малдовы Мікалаем Цімофці.**



Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на высокі ўзровень тавараабароту — $400 млн, які краіны дасягнулі па выніках мінулага года. Тым не менш, па словах Прэзідэнта Беларусі, у дзвюх краін ёсць рэзервы для нарошчвання аб'ёмаў узаемнага гандлю.

Што тычыцца падпісання Малдовай пагаднення аб асацыяцыі з Еўрапейскім саюзам, то Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускі бок не драматызуе сітуацыю з арыентацыяй Малдовы на Еўрасаюз і не палітызуе факт падпісання гэтага дакумента. На думку Прэзідэнта Беларусі, у любой сітуацыі варта шукаць варыянты, каб выкарыстоўваць яе на карысць дзвюх краін.

«Мы паважаем абраны вамі курс развіцця і ўспрымаем яго як данасць, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Мы прытрымліваемся прагматычнай пазіцыі ў гэтым пытанні».

«Разам з тым лічу, што нам неабходна дакладна ўяўляць, якім будзе наша супрацоўніцтва ў новых рэаліях, паколькі і ў Малдовы, і ў Беларусі ёсць абавязацельствы перад партнёрамі па інтэграцыйных аб'яднаннях», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, пры выверанным і ўзважаным падыходзе можна не толькі мінімізаваць рызыкі для двухбаковага гандлю, але і выкарыстоўваць перавагі ад інтэграцыі розных кірункаў, стаць своеасаблівым мостам паміж дзвюма інтэграцыйнымі структурамі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі з Малдовай няма нявырашаных пытанняў і закрытых для абмеркавання тэм. Паводле яго слоў, актыўны палітычны дыялог, пабудаваны на прынцыпах раўнапраўя, спрыяе далейшаму паглыбленню беларуска-малдаўскага супрацоўніцтва. Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што краіны канструктыўна ўзаемадзейнічаюць на міжнароднай арэне.

Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначыў узаемную зацікаўленасць дзвюх краін у наладжванні эканамічнага партнёрства. Паводле яго слоў, у гэтым кірунку бакі працуюць выключна прагматычна. Малдова для Беларусі з'яўляецца чацвёртым па тавараабароце партнёрам сярод краін СНД.

Беларусь пастаўляе шырокі пералік тавараў, запатрабаваных на рынку Малдовы. Гэта аўтатрактарная тэхніка, прадукцыя нафтахімічнага комплексу, лекі, халадзільнікі, газавыя пліты, тавары лёгкай прамысловасці, малочныя вырабы.

Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму рэалізацыі кааперацыйных праектаў. Ён адзначыў, што ў Малдове выбраляюцца беларускія тралейбусы і трактары, прапрацоўваецца праект зборачнай вытворчасці аўтобусаў МАЗ. Беларускія вытворцы гатовы да павелічэння аб'ёмаў выпуску прадукцыі на дзеючых вытворчасцях. На думку кіраўніка беларускай дзяржавы, ёсць магчымасць для планамернага павышэння працэнта лакалізацыі з тым, каб выйсці з сумесна выраблена прадукцыяй на рынкі суседніх еўрапейскіх краін.

СТАР. 2

# «ВЯСЁЛКАВЫЯ» КАНІКУЛЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У сярэдняй школе вёскі Магільна Уздзенскага раёна ўчора пачалася другая змена дзіцячага круглasутачнага лагера грамадзянска-патрыятычнага кірунку «Вясёлка», у якім адпачываюць 60 дзяцей са шматдзетных сямей, у тым ліку з дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. На тры летнія тыдні адпачынку прывезла ў лагер чатырох сваіх дзяцей і Таццяна Коршук з Узды, а ўсяго ў іх сям'і — васьмёра дзяцей.**

# БЕЗ НЯВЫРАШАНЫХ ПЫТАННЯЎ І ЗАКРЫТЫХ ТЭМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што з улікам развітай прамысловай і транспартна-лагістычнай інфраструктуры Беларусь можа стаць пляцоўкай для перапрацоўкі, захоўвання і прасоўвання малдаўскіх тавараў на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў гэтым плане Беларусь адкрыта для прапаноў малдаўскага боку. «Галоўнае — каб гэтая прадукцыя была якаснай і прадпрымальнікі ішлі да нас з адкрытымі сэрцам і душой! Ніякіх хабараў, ніякіх пабораў! І якасці! Перамог на конкурсе, на тэндары — усё будзе сумленна і справядліва», — сказаў беларускі лідар.

Адначасова ёсць зацікаўленасць у арганізацыі сумеснай перапрацоўкі малдаўскай плодаагародніннай прадукцыі ў Беларусі. Толькі ў 2014 годзе 42% аб'ёму малдаўскага экспарту вінаробнай і каля 25% плодаагароднінннай прадукцыі прыпалі на нашу краіну.

Беларусь таксама гатова падзяліцца сваімі напрацоўкамі ў тых сферах, дзе мае сур'ёзны вопыт і рэсурсы, у прыватнасці ў будаўніцтве дарог і інфраструктуры, узвядзенні малочнатаварных комплексаў і іншых сельгасаб'ектаў. Па словах кіраўніка беларускай дзяржавы, бакам можна больш актыўна папрацаваць у гэтых кірунках, калі ў гэтым ёсць цікавасць малдаўскіх партнёраў.

Прэзідэнт Беларусі лічыць, што для наладжвання сувязяў паміж суб'ектамі гаспадарання неабходна таксама выкарыстоўваць патэнцыял узаемадзеяння гандлёва-прамысловых палат і іншых структур, якія аб'ядноўваюць дзелавых колаў. На думку Аляксандра Лукашэнкі, трэба часцей праводзіць і бізнес-форумы.

Кіраўнік беларускай дзяржавы з задавальненнем адзначыў высокую інтэнсіўнасць двухбаковых кантактаў у гуманітарнай сферы — навуцы, адукацыі, спорце і іншых галінах. Ён лічыць, што чарговым крокам у гэтым кірунку стане правядзенне Дзён культуры Беларусі ў Малдове восенню гэтага года, а ў наступным годзе Беларусь чакае малдаўскіх дзеячаў культуры з візітам у адказ.

«У нас няма ніякіх камянёў за пазухай. Мы вельмі адкрыты ў адносінах з нашымі малдаўскімі сябрамі», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў дзвюх краін ёсць тая аснова, на якой можна будаваць двухбаковыя адносіны. Ён выказаў упэўненасць, што пасля гэтага візіту ў Беларусь Прэзідэнта Малдовы краіны значна дабавяць у супрацоўніцтве, хоць гэты ўзровень ужо сёння дастаткова высокі. «Але ёсць да чаго імкнуцца, ёсць куды расці, і мы поўныя рашучасці гэта зрабіць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Па выніках перамоў прэзідэнты канстатавалі, што адбылася прадуктыўная і прадметная размова. Значную ўвагу лідары дзвюх краін надалі пошуку новых фарматаў узаемадзеяння з мэтамі развіцця двухбаковых гандлёва-эканамічных сувязяў.

У прысутнасці прэзідэнтаў Беларусі і Малдовы быў падпісаны шэраг дакументаў.

У прыватнасці, бакі падпісалі мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам прамысловасці Беларусі і Міністэрствам эканомікі Малдовы аб укараненні сумеснага праекта па абнаўленні парка пасажырскага транспарту ў Малдове, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

■ Выбары-2015

# ЯШЧЭ ШЭСЦЬ ЗАЯВАК

**У перадапошні дзень да заканчэння прыёму заяў ад асоб, якія маюць намер удзельнічаць у прэзідэнцкай гонцы, у Цэнтральную камісію па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў звярнуліся яшчэ шэсць чалавек: Канавец Андрэй Уладзіміравіч, Караткевіч Таццяна Мікалаеўна, Лябедзька Анатоль Уладзіміравіч, Статкевіч Мікалай Віктаравіч, Рамаоўская Жанна Мікалаеўна і Першына Ірына Міхайлаўна. Пра гэта паведамляе афіцыйны сайт ЦВК. Былі прадстаўлены дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па зборы подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдатамі ў прэзідэнты Беларусі.**

Удзел у кампаніі 36-гадовага прадпрымальніка з Наваполацка Андрэя Канаўца стаў нечаканасцю для СМІ і палітыкаў. «Звязда» высветліла, што гэты прэтэндэнт на пасаду кіраўніка дзяржавы жыве і працуе ў Мінску, дзе ўзначальвае створанае год таму прыватнае прадпрыемства «Любімае падарожжа». У Мінгарвыканкаме фірма зарэгістравана як турыстычнае агенцтва. Чацвёрты ўдзельнік прэзідэнцкай гонкі пацвердзіў нашаму выданню, што не прадстаўляе ніякую палітычную сілу, а інфармацыю пра яго можна знайсці пакуль толькі ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте». Кіраўнік яго ініцыятыўнай групы — Дзмітрый Піліпчук.

Таццяна Караткевіч вылучаецца ад кааліцыі «Народны рэферэндум», у якую ўваходзяць палітычны рух «За свабоду», партыя Беларускі народны фронт, грамадзянская кампанія «Гавары Праўду» і Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада). Кіраўнік ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў у падтрымку Таццяны Караткевіч у якасці кандыдата — Андрэй Дзмітрыеў.

Анатоль Лябедзька з'яўляецца лідарам Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Кіраўнік яго ініцыятыўнай групы — Віктар Карнеенка.

Мікалай Статкевіч адбывае пакаранне па абвінавачванні ў арганізацыі масавых беспарадкаў 19 снежня 2010 года на плошчы Незалежнасці ў Мінску. Заяву ад яго імя ў ЦВК прынеслі прадстаўнікі ініцыятыўнай групы, якой кіруе жонка прэтэндэнта Марына Адамовіч. Тэрмін пазбаўлення волі Мікалая Статкевіча заканчваецца ў снежні 2016 года.

Цэнтральная камісія па выбарах нагадвае, што ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь па нараджэнні, не маладзейшы за 35 гадоў, які валодае выбарчым правам і пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь не менш за дзесяць гадоў непасрэдна перад выбарамі. Не мае права быць кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь грамадзянін, які мае судзімасць.

Ужо пасля пяці гадзін вечара ў ЦВК паступілі заявы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп ад Жанны Раманоўскай (кіраўнік групы — Яўген Напорка) і Ірыны Першынай (кіраўнік — Марыя Храмцова).

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

■ Грамадскае жыццё

# ПА-ЖАНОЧАМУ — АДКАЗНА І НЕАБЫЯКАВА

**Пасяджэнне праўлення Беларускага саюза жанчын было гэтым разам вельмі інфармацыйна насычаным, бо размова вялася пра важныя падзеі і ў жыцці гэтай буйной грамадскай арганізацыі, і ў жыцці грамадства ўвогуле.**

Стала вядома аб маючай адбыцца змене кіраўніка арганізацыі. **Старшыня Беларускага саюза жанчын Надзея ЕРМАКОВА** назвала сваю пераемніцу. Пазачарговая канферэнцыя аб'яднання, на якой адбудуцца перавыбары, пройдзе 15 жніўня.

Надзея Ермакова лічыць, што вельмі важна даваць магчымасць актыўна працаваць маладым. «Яны крэатыўныя, маюць іншы погляд на рэчы. Таму лічу патрэбным прасіць зняць свае паўнамоцтвы старшыні Беларускага саюза жанчын. Я бачу свайго пераемніка і ўпэўнена, што гэты кандыдат справіцца з задачай», — сказала Надзея Ермакова. У якасці свайго пераемніка яна назвала міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяну Шчоткіну, адзначыўшы, што сфера дзейнасці Марыяны Акіндзінаўны дазваляе ёй быць у курсе ўсіх асноўных праблем беларускіх жанчын і іх сем'яў, дае магчымасць дапамагаць у іх вырашэнні.

На маючай адбыцца пазачарговай канферэнцыі ў жніўні таксама плануецца ўнесці змяненні і дапаўненні ў Статут БСЖ, у прыватнасці пашырыць задачы аб'яднання, замацаваць за яго членамі абавязак выплаты членскіх узносаў і ўнесці некаторыя іншыя нававядзенні.

* * *

Беларускі саюз жанчын не можа застацца ў баку ад такой важнай палітычнай падзеі, як перадвыбарная кампанія, якая пачалася ў краіне, і гатовы актыўна ў яе падключыцца. Так, **старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі БСЖ Ірына СЦЕПАНЕНКА** заявіла, што плануецца вылучыць назіральнікаў ад арганізацыі на кожны выбарчы ўчастак вобласці. **Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**, у сваю чаргу, лічыць, што Беларускі саюз жанчын, увогуле жанчыны, не абыякавыя да сваёй будучыні, павінны актыўна ўключыцца ў агітацыйны працэс, проста распавядаючы пра тое, як яны жывуць, пра свае сем'і, імкненні. «Нам не трэба нічога даказваць, мы краіна, якая адбылася, бачым, як шмат зроблена, і зробім яшчэ больш, калі будзем разам», — заявіла міністр. На думку Ліліі Ананіч, Беларускі саюз жанчын павінен таксама заклікаць усіх удзельнікаў выбарчай кампаніі да максімальна карэктнай выбарчай агітацыі.

Што датычыцца даступнасці інфармацыі ў краіне, міністр інфармацыі паведаміла, што сёння ў інфармацыйнай прасторы зарэгістравана 1,5 тысячы нацыянальных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, дзве трэціны з якіх — недзяржаўныя. Распаўсюджваецца больш за 3 тысячы замежных друкаваных СМІ, каля 200 тэлеканалаў, не кажучы пра інтэрнэт, які літаральна працята ўсё грамадства.

«У далейшым падчас выбарчай кампаніі будзе нарастаць тая пена, на якой будуць спекуляваць нашы апаненты. Яны не пагрэбуюць ніякімі метадамі для таго, каб ліць бруд на беларускую рэчаіснасць. Ужо сёння гэта назіраецца ў інтэрнэце. Мы маем рычагі ўплыву ў адпаведнасці з законам аб СМІ, але разам з тым няма мэты і задачы кіраваць сітуацыяй адміністрацыйнымі рэсурсамі. Грамадскую думку трэба фарміраваць і жаночымі намаганнямі ў тым ліку», — лічыць Лілія Ананіч.

Міністр інфармацыі запэўніла, што СМІ Беларусі забяспечаць грамадзянам правы атрымання інфармацыі і стварэння роўных умоў для кандыдатаў у Прэзідэнты, каб іх выбарныя праграмы, прапановы сталі шырока вядомымі кожнаму жыхару краіны, кожнаму выбаршчыку для прыняцця ўсвядомленага рашэння на карысць далейшага развіцця Беларусі. На яе думку, выбары — гэта момант ісціны для дзяржавы, якая за 20 гадоў адбылася як суверэнная.

**Беларускі саюз жанчын быў створаны ў 1991 годзе і сёння, нароўні з Федэрацыяй прафсаюзаў, ветэранскай арганізацыяй і БРСМ, з'яўляецца адной з самых уплывовых грамадскіх арганізацый у краіне. Гэта падкрэсліў і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Сёння саюз аб'ядноўвае больш за 170 тысяч жанчын. Нядаўна ў ім з'явіліся дзве новыя структуры: клуб жанчын-медыкаў і клуб творчых жанчын «Спадчына».**

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

# НАЛАДЖАНЫ ДЫЯЛОГ

**Ужо традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць і ў гэтую суботу**

18 ліпеня жыхары ўсіх рэгіёнаў краіны атрымаюць магчымасць задаць пытанні ўладам. Прамыя тэлефонныя лініі пройдуць з **9.00 да 12.00**.

Нагадаем, сёлета з 17 студзеня па суботах арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам прамых тэлефонных ліній з мэтай павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

**Тэлефонныя лініі ў гэтую суботу праводзяць:**

**Брэсцкі аблвыканкам:**
першы намеснік старшыні ТОКАР Мікалай Васільевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам:**
намеснік старшыні ДЗЯМ'ЯНАЎ Эдуард Міхайлавіч (80212204260);

**Гомельскі аблвыканкам:**
намеснік старшыні ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам:**
намеснік старшыні АГЕЙ Алена Аляксандраўна (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам:**
намеснік старшыні СІРЭНКА Віктар Іванавіч (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам:**
старшыня ДАМАНЕЎСКІ Уладзімір Віктаравіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам:**
старшыня ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч (80172224444).

■ Надвор'е

# КРЫХУ ПАЦЯПЛЕЕ, АЛЕ МЕСЦАМІ ДАЖДЖЫ

## Аднак у суботу па паўднёвым захадзе прыпячэ аж но да 28-32 цяпла



**Сёння ўдзень умовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будзе ў асноўным вызначаць вобласць паніжанага атмасфернага ціску і малаактыўныя франтальныя раздзелы. Спецыялісты Белгідраметцэнтра паведамляюць, што чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Месцамі кароткачасовыя дажджы і навальніцы.**

Удзень прагназуецца ўмераны заходні вецер, пры навальніцах — парывісты. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 20-26 градусаў, а па паўднёвым захадзе да 28 цяпла. У суботу тэрыторыя нашай краіны трапіць у зону павышанага атмасфернага ціску, таму толькі ўначы на ўсходзе, а ўдзень і ў заходніх раёнах Беларусі будзе адчувацца ўплыў няўстойлівых вільготных паветраных мас. У сувязі з гэтым пераважна без ападкаў, толькі ўначы ў крайніх усходніх, а ўдзень у заходніх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 7 да 14 цяпла, удзень ужо пацяплее да плюс 21-27 градусаў, а ў паўднёва-заходніх раёнах — 28-32 цяпла.

Сіноптыкі прагназуюць, што ў нядзелю праз Беларусь пройдзе кантрасны атмасферны фронт з тэрыторыі Польшчы. Таму будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у заходніх раёнах на большай частцы пройдуць кароткачасовыя дажджы. Надвор'е ў гэты дзень будзе з норавам, бо месцамі прагназуюцца моцныя дажджы, навальніцы, а ўдзень у асобных раёнах магчымы град. Раніцай і ўдзень пры навальніцах чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю складзе плюс 13-20 градусаў, удзень — 19-26 цяпла, а ў паўднёвых раёнах плюс 27-30 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

УНП 101015738
РУП «Белпочта»
**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ**
**по выбору подрядной организации для выполнения работ по осуществлению технического надзора за строительством объекта «Строительство производственного здания по обмену и обработке авиапочты на территории Национального аэропорта «Минск».**
**Процедура переговоров состоится «21» июля 2015 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**
Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел.: 293-55-29, 293-55-28.

Утерянный страховой полис ЗАО «СК «ЭРГО» серии БО № 417157 **считать недействительным.**

■ Ці чулі?

# «РОДНЫ» ПАВУК СВАІХ НЕ ЧАПАЕ



**Днямі ў шматлікіх СМІ з'явілася цікавая інфармацыя: жыхар Гродна, што некалькі гадоў назіраў за членістаногімі ў горадзе і наваколлі, заўважыў у раёне мелавых кар'ераў незвычайны, па яго словах, для Беларусі від — варонкавага павука сямейства Agelenidae.**

Членістаногае з'яўляецца блізкім родзічам тарантула і быццам бы нясе небяспеку для чалавека. Гарадзенец піша, што драпежнік можа пераследаваць сваю ахвяру на працягу гадзіны, мае моцныя жвалы і небяспечны яд. Акрамя прамой небяспекі для дзяцей і людзей, якія маюць алергію, варонкавы павук сваім укусам можа занесці ў арганізм інфекцыю. Аўтар выклаў у сецыва і відэа, на якім добра відаць даволі буйнога па памеры васьмівокага, што сядзіць у тунэлепадобнай схованцы з павуціння. Па словах гарадзенца, такіх павукоў у ваколіцах Гродна дастаткова многа. Аўтар настойліва раіць людзям пазбягаць сустрэчы з імі.

— Насамрэч, прадстаўнікі гэтага сямейства з'яўляюцца традыцыйнымі для Беларусі, — пракаментаваў гэты выпадак «Звяздзе» **выканаўца абавязкаў генеральнага дырэктара навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук па біярэсурсах Вадзім ЦЫНКЕВІЧ**. — Яны жылі тут заўсёды, таму размова пра з'яўленне нейкіх новых інвазійных відаў не ідзе. Іх небяспека для чалавека — таксама чуткі. У літаратуры сустракаецца інфармацыя, што ў Амерыцы за ўвесь час былі зафіксаваны толькі адзін кантакт чалавека з тамтэйшым павуком гэтага віду, які прывёў да з'яўлення нарыву на скуры. Верагодна, гэта было звязана не з ядам, а з занясеннем інфекцыі хеліцэрамі. Звычайна гэты орган у варонкавых павукоў недастаткова моцны, каб пракусіць скуру. Прасцей кажучы, прадстаўнікі сямейства Agelenidae не больш страшныя для чалавека за астатнія, што сустракаюцца ў Беларусі. Адзіны сапраўды небяспечны від, які жыве ў нашай краіне, — гэта паўднёварускі тарантул.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# ЛЕГЕНДЫ БІЯТЛОНА ЗБІРАЮЦЦА Ў МІНСК!

**Фестываль «Гонка легенд — зоркі біятлона за мір» пройдзе 12 верасня ў абноўленым Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі «Раўбічы».**

Тут збяруцца найлепшыя біятланісты, якія не менш за 20 разоў падымаліся на найвышэйшую прыступку п'едэстала гонару зімовых Алімпійскіх гульняў у розныя гады, пачынаючы з Сараева-1984 і заканчваючы Ванкуверам-2010.

Легендарныя спартсмены правядуць на трасе дзве гонкі. Спачатку пройдуць спаборніцтвы ў суперспрынце, па выніках якіх удзельнікі сфарміруюць каманды для выступлення ў эстафеце, дзе і будуць разыграны ўзнагароды.

Запрашэнне Дар'і Домрачавай на фестываль прынялі шматразовыя пераможцы Алімпійскіх гульняў з Германіі Свен Фішэр, Рыка Грос, Міхаэль Грайс і чэмпіёнка свету Сымона Хаусвальд (Дэнкінгер). Удзел таксама возьмуць знакамітыя прадстаўнікі Нарвегіі — трохразовы алімпійскі чэмпіён Халвард Ханэвалд, вядомыя спрынтары Фрудэ Андрэсэн і Ларс Бергер. Апошні, дарэчы, з'яўляецца яшчэ і чэмпіёнам па лыжных гонках. У госці ў Раўбічы прыбудуць і ўладальніцы Вялікага хрустальнага глобуса Ліў-Грэтэ Пуарэ, Хелена Экхальм і алімпійская чэмпіёнка Турына-2006 Анна-Карын Зідэк.

Расію прадставяць двухразовая алімпійская чэмпіёнка Ганна Багалій і Юрый Кашкараў, які выйграваў драматычную алімпійскую эстафету ў Сараеве-1984 разам з беларусам Сяргеем Булыгіным. Больш чым праз 30 гадоў яны зноў выступяць у адной гонцы. Ад Беларусі, акрамя Сяргея Булыгіна, у спаборніцтвах возьме ўдзел алімпійскі чэмпіён Калгары-1988 Аляксандр Папоў і шматразовы прызёр чэмпіянатаў свету Алена Зубрылава.

Акрамя стартаў, гоншчыкі паўдзельнічаюць у аўтограф-сесіі, дзе ўсе заўзятары змогуць пагутарыць са сваімі кумірамі. Для найбольш актыўных аматараў біятлона будзе прадастаўлена магчымасць паспрабаваць сябе ў якасці спартсмена на спецыяльна падрыхтаванай арганізатарамі трасе.

Таксама гледачы змогуць пакаштаваць стравы нацыянальнай кухні ўдзельнікаў Гонкі легенд, а госці краіны набыць у створаным арганізатарамі горадзе майстроў унікальныя сувеніры з Беларусі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Прыёмная кампанія — 2015

# БОЛЬШ ЯК 300 БАЛАЎ
## у кожнага другога абітурыента БДУ

**15 ліпеня завяршыўся прыём дакументаў на бюджэтную форму навучання ў ВНУ. І ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ўжо падводзяць першыя вынікі прыёмнай кампаніі.**

На 2023 месцы на дзённай форме навучання дакументы падалі 3483 абітурыенты. Такім чынам, сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў 1,72 (у 2014 — 1,47).

У БДУ з задавальненнем канстатуюць, што бягучая прыёмная кампанія вылучаецца высокім узроўнем падрыхтоўкі абітурыентаў: 47% маладых людзей, якія ўдзельнічаюць у агульным конкурсе, маюць у сваім актыве сумарны бал, вышэйшы за 300. Сярод тых, хто падаў дакументы ў вядучую ВНУ краіны, 93 пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і конкурсаў, уключаючы 7 лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Акрамя таго, у конкурсе за права быць студэнтам БДУ будуць удзельнічаць 577 абітурыентаў, якія скончылі сярэднюю школу з медалямі або сярэдня спецыяльныя навучальныя ўстановы — з дыпломамі з адзнакай (16,5% ад агульнай колькасці), і 1769 выпускнікоў ліцэяў і гімназій з усёй Беларусі (51% ад агульнай колькасці). Таксама ў гэтым годзе на педагагічных напрамкі (план прыёму складае 93 месцы) без экзаменаў будуць залічаны 23 пераможцы абласных алімпіяд і медалісты.

На спецыяльнасцях, па якіх праводзяцца ўнутраныя іспыты, самы высокі конкурс склаўся сярод ахвотных вывучаць камунікатыўны дызайн — 13 чалавек на месца і дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя — 14,8. У Інстытуце журналістыкі на спецыяльнасці «інфармацыя і камунікацыя» на адно месца прэтэндуюць 1,9 чалавека.

На завочную бюджэтную форму навучання падалі дакументы 508 абітурыентаў (план прыёму складае 270 чалавек). З іх 178 чалавек — на скарочаны тэрмін навучання. У гэтай пазіцыі сярэдні конкурс склаў 1,9 (у 2014 годзе — 1,2).

Там, дзе праводзяцца ўнутраныя экзамены, самы высокі конкурс склаўся на наступных спецыяльнасцях: «Менеджмент, фінансы і крэдыт» (скарочаны тэрмін навучання) — 2,8; «Дакументазнаўства» (скарочаны тэрмін навучання) — 2,6 і «Правазнаўства» (скарочаны тэрмін навучання) — 3,1.

Пасяджэнні прыёмнай камісіі па залічэнні на бюджэтную форму навучання адбудуцца з 17 па 23 ліпеня. Усе рашэнні па залічэнні будуць транслявацца ў анлайн-рэжыме на інтэрнэт-сайце БДУ — www.bsu.by.

Прыём дакументаў на платную форму навучання будзе доўжыцца да 2 жніўня ўключна.

Дарэчы, многія ВНУ ўжо агучылі цэны платнай формы навучання на наступны навучальны год. Кошты выраслі ў сярэднім на 10-15%.

У Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце вышэйшая адукацыя падаражэла для першакурснікаў у параўнанні з папярэднім годам на 2,2 мільёна рублёў (13%). У залежнасці ад спецыяльнасці першы год вучобы на дзённым аддзяленні абыдзецца студэнтам у суму ад 19 мільёнаў 253 тысяч да 19 мільёнаў 641 тысячы рублёў.

Першакурснікам БНТУ давядзецца заплаціць за вучобу ад 18 мільёнаў 402 тысяч рублёў да 21 мільёна 196 тысяч рублёў. Самае дарагое навучанне на спецыяльнасцях «Архітэктура» і «Архітэктурны дызайн».

Цэннікі ў БДУІР вагаюцца ад 19 мільёнаў 200 тысяч да 23 мільёнаў 500 тысяч рублёў на спецыяльнасцях самага прэстыжнага факультэта камп'ютарных сістэм і сетак. Можна не сумнявацца, што дэфіцыту ахвотных навучацца за ўласныя грошы на гэтым факультэце не будзе, бо менавіта тут быў пастаўлены ў гэтым годзе своеасаблівы рэкорд — прахадны бал на спецыяльнасць «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» на бюджэтную форму навучання склаў 370!

Атрыманне адукацыі на вячэрняй форме навучання ў БДУІР ацэньваецца ў 14 мільёнаў 350 тысяч рублёў для ўсіх без выключэння спецыяльнасцей. А студэнтам, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю па дыстанцыйнай форме навучання, за вывучэнне адной дысцыпліны давядзецца заплаціць 670 тысяч рублёў.




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце вучоба для першакурснікаў падаражэла на 2,4 мільёна (15%) — да 18 мільёнаў 460 тысяч рублёў.

У Акадэміі кіравання цэны на платнае навучанне не змяніліся і засталіся на леташнім узроўні — 18 мільёнаў 380 тысяч рублёў.

Ранейшымі засталіся цэны і ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. На спецыяльнасцях «Лячэбная справа», «Педыятрыя» і «Фармацэўтыка» адзін год навучання каштуе 19 мільёнаў 680 тысяч рублёў. На «Медыка-прафілактычнай справе» — 18 мільёнаў рублёў. А самая дарагая падрыхтоўка будучых стаматолагаў — 22 мільёны 980 тысяч рублёў у год.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт з коштам платнай адукацыі на наступны навучальны год пакуль не вызначыўся.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

### У СУР'ЁЗНАГА СТУДЭНТА І КРЭДЫТ НЕ КУСАЕЦЦА

**У найбуйнейшым банку краіны з 15 ліпеня стартавала праграма крэдытавання для моладзі ва ўзросце да 31 года. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту «Звязды» спецыялісты прэс-службы Беларусбанка. У рамках гэтай праграмы спажывецкія крэдыты прадастаўляюцца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў дзяржаўнай формы ўласнасці не ніжэй за 3-і курс, а таксама магістрантам і аспірантам не ніжэй за 2-і курс навучання пры ўмове, што яны атрымліваюць стыпендыю. Пад дзеянне праграмы гэтага крэдытавання падпадаюць і іншыя катэгорыі моладзі ва ўзросце да 31 года, якія, акрамя стыпендыі, маюць яшчэ і пастаянную крыніцу даходу. Крэдыты прадастаўляюцца маладым людзям на выгадных умовах з аплатай ад 20 да 29% гадавых. Пры гэтым якіх-небудзь дадатковых плацяжоў, камісій за суправаджэнне ці абаненцкай платы банк не спаганяе.**

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Бяспека

# ЖЫЦЦЁВА ВАЖНА
## Кіраўнікі БРСМ і МНС падпісалі дамову аб узаемным супрацоўніцтве

**Ужо даўно пры Беларускім рэспубліканскім саюзе моладзі працуюць атрады аховы правапарадку. Традыцыя гэтая ідзе яшчэ з савецкіх часоў, калі дружыннікі разам з міліцыянерамі патрулявалі вуліцы. Але цяпер яны будуць дапамагаць і супрацоўнікам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**

— Ад знешніх прычын мы штогод губляем сотні чалавек, — адзначыў **міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА**. — Людзі гінуць праз неразуменне, да чаго прыводзяць бесклапотныя адносіны. Са свайго боку мы робім упор на прафілактычную працу пачынаючы яшчэ з дзіцячага садка. Праўда, да апошняга часу пэўны прабел у нас існаваў у вышэйшых навучальных установах. Але цяпер ён будзе ліквідаваны.

Мяркуецца, што маладзёжныя актывісты разам з ратавальнікамі будуць удзельнічаць у разнастайных прафілактычных мерапрыемствах — аглядаць процілажарны стан жылля, вучыць насельніцтва, як жыць бяспечна, супрацоўнічаць з пазаштатнымі пажарнымі фарміраваннямі. І адкладваць не будуць — праца пойдзе, як кажуць, з месца ў кар'ер.

— Ужо ў пятніцу на беразе возера Медна распачнецца маладзёжны форум «Бяспека ў нашых руках», — расказаў **камандзір Брэсцкага абласнога штаба Маладзёжнага атрада аховы правапарадку БРСМ Юрый СЕГЯНЮК**. — На ім збяруцца прадстаўнікі маладзёжных атрадаў аховы правапарадку, актывісты дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў і валанцёры. Медыкі правядуць майстар-класы, на якіх пакажуць, як правільна аказаць першую дапамогу на вадзе. Ёсць у праграме і практычныя заняткі з вадалазнай службай Брэсцкага ўпраўлення МНС. Яны пакажуць, як трэба карыстацца сродкамі ратавання. Удзельнікі форуму ўжо падрыхтавалі раздатачныя матэрыялы па правілах адпачынку на вадзе. Адмысловыя аўдыяролікі, якія нагадаюць, што нельга рабіць на вадаёмах, будуць транслявацца з дапамогай спецыяльных аўтамабіляў.

Ёсць прыемная навіна і для выпускнікоў школ. Тыя з іх, хто актыўна ўдзельнічаў у грамадскай працы і зараз выбірае сваёй альма-матар вышэйшыя навучальныя ўстановы Міністэрства ўнутраных спраў, могуць атрымаць рэкамендацыі ад БРСМ, што дапамогуць пры паступленні. Як запэўніў сакратар ЦК БРСМ Дзмітрый Варанюк, налета гэтае правіла распаўсюдзіцца і на спецыялізаваныя ВНУ Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Акрамя таго, адбылася адкрытыя дэбаты «Выбірай.by!». Зборныя каманды прадстаўнікоў МААП і курсантаў Камандна-інжынернага інстытута МНС дыскутавалі наконт актуальных праблем удзелу беларускай моладзі ў забеспячэнні нацыянальнай бяспекі краіны.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Экспарт

# НЕ ЗАРЖАВЕЕ

## ПАЛОВА ПРАДУКЦЫІ АЙЧЫННАЙ МЕТАЛУРГІІ ІДЗЕ Ў ЕЎРАСАЮЗ

**Па словах намесніка начальніка кіравання металургіі і станкаінструментальнай прамысловасці Міністэрства прамысловасці Уладзіміра ХАЦКЕВІЧА, у найбліжэйшыя 5 гадоў развіццё ліцейнай вытворчасці будзе накіравана на паляпшэнне якасці ліцця і павелічэнне яе магутнасці на 30%. Таксама ён адзначыў, што хутка Беларусь выйдзе на аб'ём вытворчасці сталі ў памеры 3 млн тон у год.**

### ЛІЦЦЬ БУДУЦЬ БОЛЬШ І ЛЕПШ

«Зараз у краіне выпрацоўваецца каля 500 тысяч тон ліцця ў год, з якога больш за 300 тысяч тон — чыгуннае ліццё, каля 100 — сталь, 85 — алюмініевыя сплавы, 25 — сплавы на аснове медзі. У найбліжэйшыя пяць гадоў плануецца ўвесці каля 150 тысяч тон новых магутнасцей ліцейных вытворчасцей», — паведаміў Уладзімір Хацкевіч.

Найперш размова ідзе аб заводзе ў Стоўбцах, які дазволіць павялічыць магутнасць на 50 тысяч тон. Згодна з планам, да канца года прадпрыемства выйдзе на запланаваныя магутнасці.

«Першы этап — вытворчасць гільзаў для Мінскага маторнага завода. Цяпер гэтую прадукцыю купляюць ва Украіне і Расіі. Новая вытворчасць дапаможа ММЗ вырашаць пытанні па павышэнні якасці выпускаемых рухавікоў», — падкрэсліў прадстаўнік Мінпрама.

### НОВАЕ НА «АМКАДОРЫ»

«Высакаякаснае ліццё для гідраўтаматыкі сёння завозіцца ў Беларусь. Плануецца, што з уводам новай вытворчасці мы адмовімся ад імпарту. Таксама будзе рэалізаваны праект на «Белколермет». Там завяршаецца рэалізацыя праекта па вытворчасці меднай катанкі. Прадпрыемства да гэтага вяло толькі нарыхтоўку медзі, класіфікавала яе па марках, а далей адпраўляла на перапрацоўку ў Расію. З наступнага года 1,5 тысячы тон меднай катанкі будзе вырабляцца ў Беларусі», — растлумачыў Уладзімір Хацкевіч.

### КАМУ ПАТРЭБНЫ БЕЛАРУСКІ МЕТАЛ?

Як адзначыў спецыяліст, першапачаткова праектная магутнасць вытворчасці БМЗ была большай за 1 млн тон сталі ў год. За 30 гадоў існавання завода, дзякуючы мадэрнізацыі, гэтая лічба павялічылася ў 2,5 раза.


Фота БЕЛТА.

«Сёння завод здольны ў год зрабіць каля 2,7 млн тон сталі. У наступным годзе плануецца завяршыць некалькі праектаў па мадэрнізацыі, што дазволіць яму выйсці на магутнасць у 3 млн тон», — расказаў Уладзімір Хацкевіч.

Паводле слоў **першага намесніка генеральнага дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «БМЗ — кіруючая кампанія холдынга «БМК» Анатоля ВОЛКАВА**, за першае паўгоддзе сёлета на экспарт пастаўлена каля 90% прадукцыі прадпрыемства. Асноўныя спажыўцы — гэта Расія (15,5%), каля 50% рэалізуецца ў краінах Еўрасаюза, краіны паўночнаафрыканскага рэгіёна спажываюць 15%, астатняе прыпадае на Блізкі Усход, ЗША і Азію. У топ-10 найбуйнейшых краін-пакупнікоў завода ўваходзяць Расія, Егіпет, Германія, Польшча, Літва, Латвія, ЗША, Турцыя, Італія, Туніс.

«БМЗ рэалізоўваў сваю прадукцыю ў 114 краін, але ў 2015 годзе гэтая колькасць скарацілася да 53 дзяржаў. Шмат у чым такая сітуацыя складваецца праз негатыўныя фактары на сусветным рынку. Аднак прадпрыемства ў дадзены момант працуе з поўнай загрузкай», — растлумачыў Анатоль Волкаў.

■ Дыялог бізнесаў

# ПАСПРАБАВАЛІ І ДАМОВІЛІСЯ

**У Мінску адбыўся беларуска-малдаўскі бізнес-форум. Замежныя госці прыехалі ўжо з канкрэтнымі праектамі і прапановамі. На сустрэчы заключылі некалькі кантрактаў.**

### НОВЫЯ НАПРАМКІ

Як паведаміў **віцэ-прэзідэнт гандлёва-прамысловай палаты Малдовы Уладзімір ДЗІДЗІЛІКЭ**, прадстаўнікі Малдовы бачаць вялікія перспектывы ў рэалізацыі праектаў па кааперацыі. У першую чаргу гэта шлях да прыцягнення інвестыцый беларускіх прадпрыемстваў.

«Я лічу, што запланаваныя 500 млн долараў узаемнага тавараабароту — гэта рэальная лічба. Бо з'яўляецца шмат магчымасцей, шмат беларускіх прамысловых прадуктаў, якія будуць цікавы малдаўскаму рынку», — адзначыў Дзідзілікэ.

**Намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ** сказаў, што малдаўскія партнёры маюць пагадненне з ЕС, а гэта дазваляе прасоўваць сумесную прадукцыю на еўрапейскім рынку. У сваю чаргу для Малдовы адкрываецца ўваход у Еўразійскі эканамічны саюз.

«На гэтым форуме мы абмяркоўвалі ўмовы стварэння прадукцыі, яе сертыфікацыі, а таксама яе прасоўвання. Пакуль што ў нас усё яшчэ сціплы, традыцыйны тавараабарот. З беларускага боку гэта нафтахімія і машынабудаванне, з малдаўскага — аграрная прадукцыя. Аднак стараемся знаходзіць новыя напрамкі супрацоўніцтва. У чэрвені мы падпісалі пратакол аб пастаўцы беларускіх аўтобусаў, якія павінны замяніць увесь парк сталіцы Малдавіі», — паведаміў Уладзімір Улаховіч.

### НЕ ХАПАЕ ТЭХНІКІ

На форуме падпісалі і шэраг кантрактаў. Як адзначыла **генеральны дырэктар беларуска-малдаўскага прадпрыемства «Керамін-Малдова» Ганна БАБІНА**, кампанія заключыла кантракт з СП «Белюкс ЛТД», якое працуе ў галіне вытворчасці мэблі для ванных пакояў. Сума кантракта складзе каля 600 тысяч долараў. Прадукцыя будзе пастаўлена ў найбліжэйшыя дзесяць дзён. Таксама «Керамін-Малдова» будзе весці перамовы з «Пінскдрэў».

Малдаўская кампанія «AUTO-PREZENT», якая на працягу доўгага часу працуе з «МАЗ», «Амкадор», «Белдартэхніка» і іншымі беларускімі прадпрыемствамі ў сегменце дарожнага, камунальнага машынабудавання, жадае арганізаваць сумесныя зборачныя прадпрыемствы ў Малдове.

«Мы маем вопыт гэтых работ і неабходную вытворчую базу, — адзначыў **дырэктар кампаніі «AUTO-PREZENT» Уладзімір АРГЕТКІН**. — Можам сумесна з буйнымі машынабудаўнічымі кампаніямі арганізаваць выпуск камбінаваных дарожных машын, камунальнай тэхнікі, смецявозаў, тэхнікі на базе трактароў. Патрэба ў такой тэхніцы сёння дастаткова высокая. Многія населеныя пункты Малдовы ўкамплектаваны старымі зношанымі машынамі».

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Перспектыва

# ЖАМЧУЖЫНА ШАЎКОВАГА ШЛЯХУ

**Падчас Кітайска-Беларускага форуму па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве былі прадстаўлены інвестыцыйныя магчымасці Беларусі і патэнцыял кітайскай правінцыі Цынхай. Пасля заканчэння прэзентацый беларускі бок падпісаў шэраг дамоў з КНР. Таксама адбылася кантактная-кааперацыйная біржа, падчас якой партнёры абмеркавалі пытанні прамысловай кааперацыі і эканамічнага супрацоўніцтва.**

Акрамя таго, у атэлі «Пекін» была арганізавана выстава арыгінальнай прадукцыі, што вырабляецца кампаніямі правінцыі Цынхай. Кітайскія прадпрымальнікі прадставілі мадэль беспілотнага лятальнага апарата, вымяральныя прыборы, прадукты харчавання, алкагольныя напоі, тыбецкія лекавыя прэпараты, дывановыя вырабы, тэкстыль і вырабы з воўны, пуху, кашміру.

«Галоўнае — напаўненне нашага супрацоўніцтва канкрэтным зместам, канкрэтнымі праектамі», — адзначыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалай СНАПКОЎ**. «Кітайска-беларускі індустрыяльны парк — адзін з элементаў палітыкі адкрытасці эканомікі Беларусі, як сказаў Старшыня КНР Сі Цзіньпін, з'яўляецца жамчужынай сучаснага Шаўковага шляху», — растлумачыў Мікалай Снапкоў.

Як заўважыў **сакратар КПК правінцыі Цынхай Ло ХУЭЙНІН**, Беларусь адрознівае добрая прамысловая база, развітае машынабудаванне, сельская гаспадарка, жывёлагадоўля, IT-сфера. «Кітайска-беларускі індустрыяльны парк адрознівае льготная інвестыцыйная палітыка і добры дзелавы клімат. Усё гэта служыць гарантыяй развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі», — падкрэсліў ён.

Па словах **намесніка міністра эканомікі Аляксандра ЯРАШЭНКІ**, быў падпісаны шэраг пагадненняў: «Самым знакавым, на мой погляд, з'яўляецца заключанае пагадненне паміж некалькімі бакамі: кітайскай кампаніяй, якая займаецца біяфармацыяй, індустрыяльным паркам «Вялікі камень», дзе плануюць развіваць высокатэхналагічную вытворчасць з удзелам беларускага лёну. Кітайскі бок разглядзіць магчымасць фінансавання сяўбы і ўборкі лёну, каб потым вырабляць лекавыя прэпараты, а таксама экспартаваць іх».

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*



■ Меркаванне

# ІРАНСКІ ПРАРЫЎ



**Пасля некалькіх драматычных пераносаў тэрмінаў перагавораў і нават песімістычных прагнозаў некаторых аналітыкаў, што размова Ірана з «шасцёркай» (Расія, Кітай, Францыя, Германія, Вялікабрытанія і ЗША) сарвецца, бакі ўсё ж змаглі прыйсці 14 ліпеня да разумнага кампрамісу.**

Як і ў выпадку з грэчаскімі перагаворамі, якія праходзілі ў апошнія месяцы, далёка не ўсе задаволены ўмовамі здзелкі, але фінальнае пагадненне дасягнута. У адпаведнасці з ім, іранская ядзерная праграма зведае сур'ёзныя змены. Міжнароднае агенцтва па ядзернай энергетыцы (МАГАТЭ) атрымае бесперашкодную магчымасць інспектаваць усе ядзерныя аб'екты Ірана, а квота інспектараў будзе павялічана да 130-150 чалавек. Некаторыя аб'екты, якія выклікаюць найбольшыя падазрэнні МАГАТЭ або заходніх краін, інспектары змогуць наведваць штодня, а некаторыя — раз на месяц.

Уведзеныя абмежаванні не дазволяць Ірану стварыць новыя магутнасці па вытворчасці зброевага плутонію, а існуючыя яму давядзецца перааршентаваць на іншыя мэты. Уводзяцца і абмежаванні на запасы нізкаўзбагачанага ўрану, якія могуць захоўвацца ў краіне: усе лішкі ўрану прыйдзецца вывезці на перапрацоўку. Гатоўнасць аказаць садзейнічанне ў перапрацоўцы выказала Расія, якая таксама будзе пастаўляць Ірану прыродны ўран.

У выніку пагаднення заходнія краіны павінны будуць зняць з Ірана большасць санкцый. Найбольшае значэнне будзе мець адмена санкцый Еўрасаюза, якія перашкаджалі ажыццяўленню іранскімі кампаніямі банкаўскіх аперацый, аперацый страхавання і блакіравалі доступ да міжнароднай сістэмы плацяжоў SWIFT, а таксама сумесныя заходнія санкцыі па абмежаванні экспарту нафты з Ірана. Паводле ацэнак экспертаў, у выніку гэтых санкцый Іран штогод страчваў ад 40 да 80 мільярдаў долараў, у залежнасці ад кан'юнктуры цэн на сусветных рынках на нафту.

Прычыны пагаднення «шасцёркі» з Іранам дастаткова празрыстыя. Самі ўведзеныя санкцыі выглядалі даволі штучна і дрэнна ўплывалі на імідж заходніх краін. Атрымлівалася дзіўная сітуацыя: нават калі верыць абвінавачванням Захаду, што Іран спрабуе стварыць ядзерную зброю (што сам Тэгеран упарта адмаўляў), выкарыстанне санкцый за гэта з боку дзяржаў, якія самі маюць ядзерную зброю, з'яўляецца відавочным прыкладам двайных стандартаў. З пункту гледжання разумнага сэнсу, каб мець маральнае права ўводзіць санкцыі за спробу стварэння ядзернай зброі, трэба самім адмовіцца ад яе. Усе цудоўна разумелі, што галоўнае значэнне санкцый — звязаць па руках і нагах сур'ёзнага геапалітычнага канкурэнта Захаду і яго саюзнікаў у рэгіёне, асабліва Ізраіля і Саудаўскай Аравіі. Усё гэта вельмі дрэнна пахла і ніяк не суадносілася з лозунгамі аб роўнасці ўсіх краін у новым дэмакратычным свеце пад уладай Захаду. Асабліва ўлічваючы, што сам Ізраіль дэ-факта мае ядзерную зброю, але супраць яго ніякіх санкцый не выкарыстоўваецца.

Калі паглядзець на дамоўленасці 14 ліпеня з пункту гледжання беларускіх нацыянальных інтарэсаў, то іх можна прызнаць карыснымі для нашай краіны. Мінск і Тэгеран маюць цудоўныя палітычныя адносіны, якія пастаянна спрабуюць развіваць у эканамічнай плоскасці.

У апошнія гады з'явіліся і новыя прычыны для таго, каб перагледзець адносіны з Іранам. Абмежаваўшы яго ўплыў у рэгіёне, Захад фактычна палепшыў умовы для тэрарыстаў усіх масцей свабодна ў ім апераваць. Росквіту тэрарызму садзейнічалі і заходнія аперацыі ў рэгіёне супраць Ірака, Афганістана, Лівіі і Сірыі, якія пакінулі вялізныя тэрыторыі без дзеяздольнага дзяржаўнага кіравання.

Усе спробы справіцца з выпушчаным з бутэлькі джынам тэрарызму аказаліся няўдалымі, тым больш што не ўсе заходнія краіны былі ў гэтым зацікаўлены, а мясцовыя партнёры заходніх краін у рэгіёне прадэманстравалі адкрытую бездапаможнасць. У выніку настаў час запусціць у рэгіёне незаходнія процівагі анархіі і распаўсюджванню тэрарызму. І Іран з'яўляецца кандыдатам нумар адзін на гэтую ролю.

Пры гэтым калі яшчэ нядаўна заходнія краіны лічылі, што Тэгеран вызнае занадта радыкальную версію ісламу, то зараз шыіцкі рэжым Ірана падаецца цалкам прымальным на фоне сапраўднага радыкалізму самаабвешчанай «Ісламскай дзяржавы», які захапіў значную частку тэрыторый Ірака і Сірыі.

Дарэчы, ён з'яўляецца натуральным ворагам Ірана з прычыны таго, што гэтая групоўка замахваецца на тэрыторыі краін-саюзнікаў Ірана ў рэгіёне. Можна быць упэўненым, што марай некаторых заходніх аналітыкаў з'яўляецца сітуацыя, калі «Ісламская дзяржава» і Іран будуць гадамі знясільваць сябе ва ўзаемным сутыкненні, нівеліруючы магчымасці абедзвюх сіл канкурыраваць з самім Захадам. Ну, а калі адна з гэтых сіл выйграе, можна будзе прыдумаць што-небудзь яшчэ.

Калі паглядзець на дамоўленасці 14 ліпеня з пункту гледжання беларускіх нацыянальных інтарэсаў, то іх можна прызнаць карыснымі для нашай краіны. Мінск і Тэгеран маюць цудоўныя палітычныя адносіны, якія пастаянна спрабуюць развіваць у эканамічнай плоскасці. На жаль, гэтыя спробы прыпалі якраз на перыяд увядзення і далейшага выкарыстання жорсткіх санкцый супраць Ірана, што сур'ёзна абмежавала патэнцыял эканамічнага супрацоўніцтва. Адмена іх большасці дазволіць вярнуцца да рэалізацыі сур'ёзных інвестыцыйных праектаў Ірана на беларускай тэрыторыі.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

Павел БАРАНАЎ:

# «ЛЮБОЎ ДА АДЗІНАБОРСТВАЎ У МЯНЕ З ДЗЯЦІНСТВА»

**Спартыўны каментатар «Белтэлерадыёкампаніі» Павел Баранаў для многіх балельшчыкаў асацыюецца выключна з футболам. Нягледзячы на гэта, сам Павел здаўна каментуе бокс, барацьбу, цяжкую атлетыку і ўжо тры гады робіць відэачасопіс «Фактар сілы» пра адзінаборствы і сілавы экстрым, якія выходзіць на тэлеканале «Беларусь 5». Менавіта гэтай тэме і прысвечана наша размова.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Павел, вас не засмучае, што для многіх вы застаецеся найперш футбольным каментатарам?***

— Насамрэч, так яно і ёсць, але як для каго. Для многіх апошнім часам сітуацыя ў гэтым плане змянілася. Я ўжо колькі гадоў, акрамя футбалістаў, працую таксама з тымі, хто займаецца адзінаборствамі, сілавымі відамі спорту. Аднойчы нашы бодзібілдары спыталі, чаму я прапусціў іх Кубак Беларусі. Сказаў, што працаваў на футбольным матчы чэмпіянату краіны. Вось для іх я больш вядомы, як каментатар, што займаецца менавіта сілавымі відамі спорту.

**Пагутарыць з легендарнымі асобамі насамрэч можна. У нашым кіраўніцтве федэрацыі бодзібілдынга ёсць тыя, хто знаёмы з Арнольдам Шварцэнегерам. Ён прыязджае на міжнародныя спаборніцтвы, і паспрабаваць выйсці на яго таксама можна.**

***— Адказ на пытанне, чаму вы заняліся праектам «Фактар сілы», напэўна, ляжыць на паверхні?***

— Так, любоў да адзінаборстваў у мяне з дзяцінства. Спачатку займаўся дзюдо, пазней — муай-тай, крыху боксам. Гэтая тэма вельмі блізкая мне. Я жыў у Мінскім раёне Уручча, і ў маёй школе працавала секцыя па дзюдо, філіял спартыўнага клуба «Вымпел». Гэты спорт быў даспадобы майму старэйшаму брату, з гэтай нагоды і я вырашыў, што дзюдо — гэта крута! Хапала ў секцыі і маіх сяброў, але далёка не ўсе надоўга затрымаліся. Я нядаўна бачыў, як у Гомелі з маленькімі дзецьмі працуе Ігар Макараў, наш славуты алімпійскі чэмпіён. Усё для дзяцей падаецца праз гульню. Так працуюць і астатнія нашы маладыя трэнеры. Гэта дзецям падабаецца. У іншым выпадку яны проста кінулі б заняткі ў секцыі. А ў нас ніякай гульні не было. Нас адразу кінулі ў працу, з'явіліся патрабаванні, ціск. Мне падабалася, аднак праз колькі гадоў трэніроўкі надакучылі, і, як трэнер мяне ні заахвочваў, я кінуў дзюдо. Мне тады было каля 16. А цяпер, калі працую на спаборніцтвах дзюдаістаў, проста бачу татамі, адчуваю, што нібы дадому вяртаюся. Калі б не было ў маім жыцці адзінаборстваў, калі б я не любіў тых, хто займаецца гэтай справай, не было б і нашай праграмы.

* * *

***— Дарэчы, як назву выбіралі?***

— Да яе прыйшлі не адразу. Бо ўсё ж такі няпроста прыдумаць назву, якая б добра запаміналася, стала брэндам. Да гэтай справы трэба падыходзіць адказна. Пайсці па лёгкім шляху і банальна назваць праект «Сілавы веснік» ці які-небудзь «Накдаўн»? Гэта не для мяне! Хацелася зрабіць так, каб можна было аб'яднаць розныя віды спорту па адной сілавой тэме. Мне здаецца, у нас атрымалася. У свой час выходзіла перадача «Асілак» Уладзіміра Даўжэнкі. На пачатку 1990-х, калі людзі масава цікавіліся культурызмам, яна глядзелася. І пэўныя традыцыі гэтай праграмы трэба было падхапіць. Толькі мы не спыніліся на адным культурызме, а пайшлі далей. Мы, напрыклад, пачалі ствараць рэйтынгі хакейных боек, калі паміж сабой на лёдзе б'юцца тафгаі, першымі ў нашай краіне на тэлебачанні распавялі пра амерыканскі футбол. Плануем узняць тэму значнасці сілавых адзінаборстваў у гульнявых відах спорту. Бо сілавая падрыхтоўка, бясспрэчна, прысутнічае ў любым кантактным відзе спорту.

***— Заўжды цікавіла, што гэта за чырвоныя трубы, на фоне якіх вы здымаеце праграму?***

— А гэта мая задумка — стыль «індастрыял». Нам хацелася зрабіць такі індустрыяльна-брутальны праект. Мне гэтая тэма даспадобы. Калі бачыш у музеі некаторыя мадэлі старадаўніх паравозаў, адразу заўважаеш, што яны больш за многія сучасныя цеплавозы, і можна толькі ўявіць сабе, якая моц была схавана ў такой машыне. Калі падобны механізм працуе, яна не можа не ўражваць. Так адбывалася нават з некаторымі тагачаснымі кампазітарамі, якія сталі ля вытокаў музычнага кірунку «індастрыял» і знайшлі ў рытмічным гомане машын тое, чаго ніколі раней не было ў прыродзе. Прамысловая рэвалюцыя спарадзіла вялізарны пласт культуры. Мяне падобная тэма цікавіла з 90-х. Вось я і вырашыў праграму зрабіць такім чынам. Атрымалася стылёва. Будзем прытрымлівацца гэтага і далей. У тым ліку дзякуючы незвычайнаму афармленню «Фактар сілы» заўважылі і ва Украіне, і ў Расіі. Глядзяць яго нават супрацоўнікі нашых амбасад у замежных краінах.

**Старт сезона адбудзецца ў верасні. Мы ўжо запланавалі першыя праграмы. Выходзіць яны будуць па пятніцах на тэлеканале «Беларусь 5». Час — вячэрні, аднак ён будзе залежаць ад жывых эфіраў на нашым канале.**

***— 26-хвілінны хранаметраж праграмы апраўдвае сябе?***

— Цалкам. Для відэачасопіса гэта самы аптымальны варыянт. Бо, напрыклад, 40-хвілінную праграму было б складана насыціць матэрыялам. На яе павінна працаваць вялікая каманда. І самае галоўнае — глядач стоміцца глядзець такую доўгую праграму. Апошні сюжэт не будзе ўражваць так, як першы. Другая частка перадачы з дынамічнай падачай матэрыялу з 5-7 сюжэтаў проста не запомніцца.

***— Колькі людзей працуе над відэачасопісам?***

— Прыкладна 7 чалавек рыхтуюць яе пастаянна. Але да нас часта просяцца ў праект збоку. Людзі хочуць мець да яго дачыненне. Я кажу: «Добра, толькі, калі ласка, праявіце сябе».

* * *

***— Ці згодны з тым, што нашым барцам, тайскім баксёрам у адрозненне ад футбалістаў не хапае ўвагі і раскручанасці?***

— Пагаджуся з гэтым. У мяне, як у аўтара «Фактара сілы», ёсць свая эгаістычная зацікаўленасць у тым, што яны не запатрабаваны. Зараз растлумачу. Падобная сітуацыя дае магчымасць выбіраць, з кім размаўляць, нам, а не ім. Тым, хто працуе з футбалістамі, хакеістамі, я шчыра спачуваю. Яны вельмі марудна ідуць на кантакт. У маёй сферы ўсё наадварот. Мяне літаральна бамбардзіруюць людзі, якія жадаюць, каб пра іх знялі сюжэт. Выбар робім мы. Але пры гэтым да сваіх герояў ставімся з павагай. Узяць тых жа барцоў. Ім, каб атрымаць званне заслужаных майстроў спорту, трэба перамагчы на чэмпіянаце свету. Гэта вельмі складаная задача, амаль геройскі ўчынак. І нашых волатаў трэба шанаваць, любіць, працаваць з імі, але пры гэтым спадзявацца, што ўвага з боку журналістаў іх не распесціць.

***— А каго з нашых таленавітых спартсменаў «раскруціў» ваш праект?***

— Аляксандра Куракa — аднаго з наймацнейшых беларускіх спартсменаў у сілавым экстрыме. Акрамя нас, ім напачатку ўвогуле ніхто не цікавіўся. Для вялікай аўдыторыі пачалі першымі расказваць пра Аляксея Шабуню — вельмі вядомага атлета ў асяродку культурыстаў. У тым жа 2012 годзе Віталь Гуркоў, шматразовы чэмпіён свету па тайскім боксе, адназначна не быў такім вядомым, як зараз. Віталь — наогул цікавы, старанны хлопец. У нас з ім выдатныя стасункі.

**Што тычыцца новага сезона, крыху зменім афармленне, студыю, увядзём новыя рубрыкі, дабавім гумару, раз на месяц будзем рабіць акцэнт на дзіцячым спорце.**

***— А якое інтэрв'ю ў рамках вашага тэлепраекта стала для вас неспадзяванкай, сапраўдным журналісцкім шанцаваннем?***

